3. Кибишева, А. А. "Библионочь": проблемы и перспективы в контексте развития связей с общественностью / А. А. Кибишева, В. А. Тимшин // А-фактор: научные исследования и разработки (гуманитарные науки). – 2017. – № 2. – С. 5.

4. Чиликин, Е. С. Новые формы продвижения чтения среди молодежи / Е. С. Чиликин // Искусствознание: теория, история, практика. – 2017. – № 2. – С. 85-92.

5. BiblioNight is coming! / National Library of Belarus [Электронный ресурс]. – Access mode: https://www.nlb.by/en/news/National-Library-of-Belarus/biblionoch-is-coming/. – Access date : 01.03.2024.

6. Shaw, M. Night at the Library: Books of Hope and Fear [Electronic resource] / Matthew Shaw. – Access mode : https://www.sas.ac.uk/research-engagement/public-engagement/public-engagement-case-studies/night-library-books-hope-and. – Access date : 01.03.2024.

Герасіменак У. Д., студэнт 450 групы
дзённай формы навучання
Навуковы кіраўнік – Лупашка І. Г.,
кандыдат культуралогіі, дацэнт

# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ І ІНАВАЦЫЙНЫЯ ФОРМЫ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ПАДЗЕЙ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

У артыкуле разгледжаны традыцыйныя і інавацыйныя формы папулярызацыі падзей Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі. Калі традыцыйныя формы гістарычна склаліся яшчэ ў мінулым стагоддзі

і працягваюць развівацца ў наш час, то інавацыйныя формы пачалі з’яўляцца адносна нядаўна, з пачаткам хуткага развіцця інфармацыйных тэхналогій, ужываннем крэатыўных падыходаў да паказу матэрыялу і інтэрактыўных метадаў для прыцягнення ўвагі да азначанай тэмы.

З кожным годам усё большае развіццё ў Беларусі атрымліваюць праекты з выкарыстаннем дасягненняў інфармацыйных тэхналогій і інтэрактыўна-забаўляльных элементаў. У 2018 г., у дні 100-годдзя заканчэння аднаго з самых страшных узброеных канфліктаў у гісторыі чалавецтва, адбылася выстава “1918. Нараджэнне новага свету”, арганізаваная на базе Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. Яна дала магчымасць наведвальнікам не толькі пазнаёміцца з каштоўным гістарычным матэрыялам, але і прадэманстравала сучасныя падыходы да інтэрпрэтацыі трагедыі Першай сусветнай вайны. Кампанія “Wargaming” прадставіла для часовай экспазіцыі эксклюзіўныя мультымедыйныя матэрыялы, прысвечаныя бронетэхніцы Першай сусветнай вайны, у тым ліку 3D-праекцыю першага серыйнага брытанскага танка “Mark”. Акрамя гэтага, на выставе былі прэзентаваны ўнікальныя артэфакты з прыватнай калекцыі У. Ліхадзедава, якія дазваляюць убачыць вайну непасрэдна вачыма яе ўдзельнікаў: знакамітага нямецкага фатографа Ф. Краўскопфа, афіцэра-артылерыста Гродзенскай крэпасці паручніка Кананава, вядомага мемуарыста-франтавіка Успенскага. Сярод экспанатаў таксама былі прадстаўлены пісьмовыя прылады каменданта Гродзенскай крэпасці генерала Кайгародава, унікальны каталог гістарычнай выставы, арганізаванай у 1918 г. у г. Мінску і творы мастацтва, створаныя ў нямецкім палоне расійскімі і французскімі афіцэрамі [1].

Раскрываецца тэматыка Першай сусветнай вайны і ў межах штогадовай акцыі “Ноч музеяў”. У Музеі гісторыі медыцыны Беларусі

18 мая 2023 г. была падрыхтавана спецыяльная інтэрактыўная пляцоўка “Ваенная медыцына часоў Першай сусветнай вайны”. На ёй арганізатары прадставілі зробленыя ў гэты перыяд прадметы для выратавання хворых і параненых, вынайдзеныя сродкі абароны ад газавых атак. Пляцоўка таксама расказала пра беларускіх урачоў, якія самаахвярна служылі на франтах адной з самых кровапралітных войнаў у беларускай гісторыі [5].

Адзін з традыцыйных спосабаў папулярызацыі значных падзей – кінематограф. Тэма Першай сусветнай вайны ў сучасным беларускім мастацкім кіно, не гледзячы на ўзрослую папулярнасць у інфармацыйнай прасторы, не атрымала дастатковага распаўсюджання. Тым не менш, ёсць некалькі цікавых прыкладаў. Адзін з іх – заснаваны на рэальных падзеях кароткаметражны беларуска-расійскі фільм “Атака мертвецов: Осовец”, які быў прадстаўлены 11 лістапада 2018 г., у дзень 100-гадовага юбілею заканчэння Першай сусветнай вайны. Фільм апавядае пра падзеі абароны крэпасці Асавец Рускай імператарскай арміяй пад час Першай сусветнай вайны і выкарыстанні слёзатачывага газу нямецкімі войскамі на Усходнім фронце.

У 2014 г. пры падтрымцы Белтэлерадыёкампаніі быў створаны праект на тэлеканале “Беларусь 1” – цыкл хроніка-дакументальных фільмаў “Вялікая вайна”, здымкі якога праходзілі па ўсёй тэрыторыі Беларусі з прыцягненнем айчынных спецыялістаў па Першай сусветнай вайне. Ён складаецца з чатырох серый: “Ачышчальная навальніца” (падзеі пачатковага перыяду: 28 ліпеня 1914 г. – 13 жніўня 1915 г.); “Вялікі зыход” (падзеі 1915–1916 гг.; жыццё пад акупацыяй і зыход насельніцтва на усход); “Вайна акопаў” (з паказам месцаў бітваў); “Крах імперый” (уплыў на лёс еўрапейскіх манархій і наступствы для іх).

Яшчэ адзін важны праект быў створаны ў 2015 г. тэлеканалам

АНТ пад назвай “Першая сусветная”. Стваральнікі фільма правялі вялікую даследчую працу ў закрытых архівах і зрабілі ўнікальныя адкрыцці. Праект уключае 10 тэматычных фільмаў, у кожным стваральнікі прасачылі лёс герояў вайны. Праца над фільмам заняла 13 месяцаў. Дзеля аднаго толькі фільма “Авіятары”, які распавядае пра лётчыкаў-выпрабавальнікаў і лятальныя апараты Першай сусветнай вайны, здымачная група праехала 40 гарадоў у 12 краінах свету [6].

Памятаюць у Беларусі і пра фільмы мінулай эпохі, прысвечаныя Першай сусветнай вайне. У 2014 г., да 100-годдзя пачатку аднаго з найбуйнейшых узброеных канфліктаў XX ст., у мінскім кінатэатры “Перамога” адбыўся прагляд класічных кінастужак. У праграме рэтраспектывы былі рэдкія дакументальныя, у тым ліку нямыя карціны вытворчасці Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі. Беларусь была прадстаўлена стужкай аднаго з заснавальнікаў айчыннага кінематографа У. Корш-Сабліна “Першы ўзвод” (1933) [4].

Спрыяюць пашырэнню аўдыторыі і папулярызацыі разглядаемай тэмы інтэрнэт-праекты. У 2014 г. Нацыянальная бібліятэка Беларусі і сайт “Архівы Беларусі” падрыхтавалі праекты, дзе кожны ахвочы можа азнаёміцца з перадумовамі пачатку баявых дзеянняў, найбольш вядомымі палкаводцамі і бітвамі, а таксама ўбачыць фотахроніку ваенных падзей. Унесла свой неацэнны ўклад у папулярызацыю падзей Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі Цэнтральная навуковая бібліятэка ім. Якуба Коласа Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі, якая прыняла ўдзел у адным з найбуйнейшых міжнародных інтэрнэт-праектаў “1914–1918-online. International Encyclopedia of the First World War” (“1914–1918-online. Міжнародная энцыклапедыя Першай Сусветнай вайны”). Асновай матэрыялаў на сайце праекту, якія прадстаўлены бібліятэкай, сталі фотаздымкі У. Паўлюкоўскага –

літаратара, перакладчыка і краязнаўцы, удзельніка Першай сусветнай вайны. Неабходна адзначыць, што праект даступны на англійскай мове і, такім чынам, папулярызуе прадстаўленыя звесткі сярод жыхароў замежных краін [3].

Адметнай формай папулярызацыі тэмы Першай сусветнай вайны з’яўляюцца аўтапрабегі. Яны цікавыя тым, што заўжды прыцягваюць увагу, а па маршрутах можна праводзіць розныя мерапрыемствы. У Беларусі аўтапрабег, прысвечаны Першай сусветнай вайне, праходзіць штогод у Вілейскім раёне Мінскай вобласці. Апошні адбыўся 21 кастрычніка 2023 г., на 105-годдзе з дня заканчэння сусветнага ваеннага канфлікту. Падчас яго прадстаўнікі ваенна-гістарычных клубаў Беларусі, рэканструктары і ўсе ахвочыя наведалі месцы памяці Першай сусветнай вайны, а таксама магілу Б. Цітовіча – мастака-графіка, іканапісца і заснавальніка дабрачынага культурна-гістарычнага фонду памяці Першай сусветнай вайны “Крокі”, які ўзначальваў арганізацыю ў 2012–2021 гг. [2].

Падводзячы вынікі адзначым, што папулярызацыя падзей Першай сусветнай вайны адбываецца як традыцыйнымі, так і інавацыйнымі сродкамі. Кінапаказы і кінапраекты, інтэрнэт-праекты і аўтапрабегі, музейныя выставы прыцягваюць новую аўдыторыю і папулярызуюць тэму Першай сусветнай вайны сярод маладога пакалення; садзейнічаюць павелічэнню ўвагі да падзей стогадовай даўніны сярод жыхароў Беларусі і замежнікаў. Заўважым, што калі традыцыйныя формы з’яўляюцца пастаяннымі, то большасць інавацыйных носяць аднаразовы ці нерэгулярны характар. На наш погляд, яны павінны праводзіцца часцей, а іх элементы мець магчымасць актыўна ўкараняцца і інтэгравацца ў турыстычную дзейнасць, каб атрымаць развіццё ў будучыні.

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. В Минске открывается выставка “1918. Рождение нового мира” [Электронный ресурс] // “Звязда”. – Режим доступа: https://zviazda.by/ru/news/20181112/1542037774-v-minske-otkryvaetsya-vystavka-1918-rozhdenie-novogo-mira/. – Дата доступа: 27.01.2024.

2. Вилейчане 21 октября могут принять участие в автопробеге по памятным местам Первой мировой войны [Электронный ресурс] // “Шлях Перамогі”. – Режим доступа: https://peramoga.by/zemlya-lyudey/vilejchane-21-oktyabrya-mogut-prinyat-uchastie-v-avtoprobege-po-pamyatnym-mestam-pervoj-mirovoj-voj ny/.– Дата доступа: 02.02.2024.

3. Международная энциклопедия Первой Мировой войны [Электронный ресурс] // Центральная научная библиотека имени Якуба Коласа Национальной академии наук Беларуси. – Режим доступа: https://csl.bas-net.by/resursy/mezhdunarodnaya-entsiklopediya-pervoj-mirovoj.asp.  – Дата доступа: 25.01.2024.

4. На телеканале “Беларусь 1” премьера – цикл хроникально-документальных фильмов “Великая война” [Электронный ресурс] // “СБ. Беларусь сегодня”. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/bez-pobediteley-i-pobezhdennykh.html. – Дата доступа: 06.02.2024.

5. Ночь музеев-2023: когда, где и в каком формате пройдет знаменитая акция [Электронный ресурс] // 1PROF.BY. – Режим доступа: https://1prof.by/news/stil-zhizni/noch-muzeev-2023-kogda-gde-i-v-kakom-forma te-projdet-znamenitaya-akcziya/.– Дата доступа: 03.03.2024.

6. Телеканал ОНТ презентовал документальный цикл “Первая мировая” [Электронный ресурс] // “СБ. Беларусь сегодня”. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/pervaya-mirovaya-v-teleformate-ont.html. – Дата доступа: 03.03.2024.